

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 36 (38) Нядзеля, 9 верасня 1945 г.

...Наступіў канец другой сусветнай вайны. Зараз мы можам сказаць, што ўмовы, неабходныя для міру ва ўсім свеце, ужо заваяваны.

І. СТАЛІН.

# ЗВАРОТ

## таварыша І. В. Сталіна да народа

Таварышы!

Суайчыннікі і суайчынніцы!

Сёння, 2 верасня, дзяржаўныя і ваенныя прадстаўнікі Японіі падпісалі акт безагаворачнай капітуляцыі. Разбітая ушчэнт на морах і на сушы і акружаная з усіх бакоў узброенымі сіламі Аб'еднаных Нацый, Японія прызнала с я б е пераможанай і склала зброю.

Два ачагі сусветнага фашызма і сусветнай агрэсіі ўтварыліся напярэдадні сучаснай сусветнай в а й н ы: Германія—на Захадзе і Японія—на Усходзе. Гэта я н ы развязалі другую сусветную вайну. Гэта яны паставілі чалавецтва і яго цывілізацыю на край гібелі. Ачаг сусветнай агрэсіі на Захадзе быў ліквідаван чатыры месяцы назад, у рэзультаце чаго Германія аказалася вымушанай капітуліраваць. Праз чатыры месяцы пасля гэтага быў ліквідаван ачаг сусветнай агрэсіі на Усходзе, у рэзультаце чаго Японія, галоўная саюзніца Германіі, таксама аказалася вымушанай падпісаць акт капітуляцыі.

Гэта азначае, што наступіў канец другой сусветнай вайны. Зараз мы можам сказаць, што ўмовы, неабходныя для міру ва ўсім свеце, ужо заваяваны.

Трэба адзначыць, што японскія захопнікі нанеслі страты не толькі нашым саюзнікам—Кітаю, Злучаным Штатам Амерыкі, Вялікабрытаніі. Я н ы нанеслі сур'ёзнейшыя страты таксама і нашай краіне. Таму ў нас ёсць яшчэ с в о й асобны рахунак да Японіі.

Сваю агрэсію супроць нашай краіны Японія пачала яшчэ ў 1904 г. у час руска-японскай вайны. Як вядома, у лютым 1904 г., калі перагаворы паміж Японіяй і Расіяй яшчэ прадаўжаліся, Японія, карыстаючыся слабасцю царскага ўрада, нечакана і вераломна, без аб'яўлення вайны,—напала на нашу краіну і атакавала рускую эскадру ў раёне Порт-Артура, каб вывесці са строю некалькі р у с к і х ваенных караблёў і стварыць, тым самым, выгаднае становішча для свайго флота. І яна сапраўды вывела са строю тры першакласных ваенных караблі Расіі. Характэрна, што праз 37 год пасля гэтага Японія дакладна паўтарыла гэты вераломны прыём у адносінах да Злучаных Штатаў Амерыкі, калі яна ў 1941 г. напала на ваенна-марскую базу Злучаных Штатаў Амерыкі ў Пірл-Харборы і вывела са строю рад лінейных караблёў гэтай дзяржавы. Як вядома, у вайне з Японіяй Расія пацярпела тады паражэнне. Японія-ж скарыстала паражэнне царскай Расіі для таго, каб адхваціць ад Расіі Паўднёвы Сахалін, замацавацца на Курыльскіх астравах, і, такім чынам, закрыць на замок для нашай краіны на Усходзе ўсе выхады ў акіян—і значыць таксама ўсе выхады да партоў совецкай Камчаткі і совецкай Чукоткі. Б ы л о ясна, што Японія ставіць сабе задачу адторгнуць ад Расіі ўвесь яе Далёкі Усход.

Але гэтым не вычэрпваюцца захопніцкія дзеянні Японіі супроць нашай краіны. У 1918 годзе, пасля ўстанаўлення совецкага ладу ў нашай краіне, Японія, карыстаючыся варожымі тады адносінамі да совецкай краіны Англіі, Францыі, Злучаных Штатаў Амерыкі і апіраючыся на іх,—зноў напала на нашу краіну, акупіравала Далёкі Усход і чатыры гады мучыла наш народ, грабіла совецкі Далёкі Усход.

Але і гэта не ўсё. У 1938 годзе Японія зноў напала на нашу краіну ў раёне возера Хасан, каля Владзівастока, з мэтай акружыць Владзівасток, а ў наступны год Японія паўтарыла свой напад ужо ў другім месцы, у раёне Мангольскай Народнай Рэспублікі, каля Халхін-Гола, з мэтай прарвацца на совецкую тэрыторыю, перарэзаць нашу Сібірскую чыгуначную магістраль і адрэзаць Далёкі Усход ад Расіі.

Праўда, атакі Японіі ў раёне Хасана і Халхін-Гола былі ліквідаваны совецкімі войскамі з вялікай ганьбай для японцаў. Такім-жа чынам была паспяхова ліквідавана японская в а е н н а я інтэрвенцыя 1918-22 гадоў, і японскія акупанты былі выкінуты з раёнаў нашага Далёкага У с х о д а. Але паражэнне рускіх войск у 1904 годзе ў перыяд руска-японскай в а й н ы пакінула ў свядомасці народа цяжкія ўспаміны. Яно лягло на нашу краіну чорнай плямай. Наш народ верыў і чакаў, што прыдзе дзень, калі Японія будзе разбіта і пляма будзе ліквіда-

(Працяг на 2-й старонцы).

# ЗВАРОТ ТАВАРЫША І. В. СТАЛІНА ДА НАРОДА

(ПРАЦЯГ)

вана. Сорак год чакалі мы, людзі старога пакалення, гэтага дня. І вось, гэты дзень настаў. Сёння Японія прызнала сябе пераможанай і падпісала акт безагаворачнай капітуляцыі.

Гэта азначае, што Паўднёвы Сахалін і Курыльскія астравы адыйдуць да совецкага Саюза і з гэтага часу яны будуць служыць не сродкам адрыву Совецкага Саюза ад акіяна і базай японскага нападу на наш Далёкі Усход, а сродкам прамой сувязі Совецкага Саюза з акіянам і базай абароны нашай краіны ад японскай агрэсіі.

Наш совецкі народ не шкадаваў сіл і працы ў імя перамогі. Мы перажылі цяжкія гады. Але цяпер кожны з нас можа сказаць: мы перамаглі. З гэтага часу мы можам лічыць нашу айчыну пазбаўленай ад пагрозы нямецкага нашэсця на Захадзе і японскага нашэсця на Усходзе. Наступіў доўгачаканы мір для народаў усяго свету.

Віншую Вас, мае дарагія суайчыннікі і суайчынніцы, з вялікай перамогай, з паспяховым сканчэннем вайны, з наступленнем міру ва ўсім свеце.

Слава ўзброеным сілам Совецкага Саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі, Кітая і Вялікабрытаніі, атрымаўшым перамогу над Японіяй!

Слава нашым далёкаўсходнім войскам і ціхаакіянскаму Ваенна—Марскому Флоту, якія адстаялі чэсць і дастоінства нашай Радзімы!

Слава нашаму вялікаму народу, народу-пераможцу!

Вечная слава героям, паўшым у баях за чэсць і перамогу нашай Радзімы!

НЯХАЙ ЖЫВЕ І КВІТНЕЕ НАША РАДЗІМА!

# УКАЗ

## Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР АБ АБ'ЯЎЛЕННІ 3 ВЕРАСНЯ СВЯТАМ ПЕРАМОГІ НАД ЯПОНІЯЙ

У азнаменаванне Перамогі над Японіяй установіць, што 3 верасня з'яўляецца днём усенароднай урачыстасці—СВЯТАМ ПЕРАМОГІ над Японіяй.

3 верасня лічыць нерабочым днём.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.
**М. КАЛІНІН.**

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.
**А. ГОРКІН.**

Масква, Крэмль.
2 верасня 1945 года.

## У Соўнаркоме СССР

У адпаведнсці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб аб'яўленні 3 верасня СВЯТАМ ПЕРАМОГІ над Японіяй Соўнарком СССР пастанавіў лічыць 3 верасня 1945 года нерабочым днём.

Совет Народных Камісараў СССР прапанаваў усім совецкім дзяржаўным установам 3 верасня гэтага года ў дзень усенароднай урачыстасці—СВЯТА ПЕРАМОГІ над Японіяй паднясць на сваіх будынках Дзяржаўны сцяг Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

## Своечасова правядзём сяўбу азімых

На раду з выкананнем абавязацельстваў па здачы хлеба дзяржаве сяляне і сялянкі нашага раёна прыступаюць да важнай гаспадарчай кампаніі—сяўбы азімых культур.

Аднак трэба адзначыць, што ход падрыхтоўкі глебы пад сяўбу азімых і сама сяўба адбываюцца маруднымі тэмпамі.

Такое становішча тлумачыцца тым, што Выканкомы сельскіх советаў не ставяць па сапраўднаму пытанні аб сяўбе азімых, а лічаць, што сеяць яшчэ рана. Так у Белавіцкім сельсовеце на полі многа не звезеных снапоў, і да ворыва пад азімыя прыступілі асобныя сяляне. Старшыня сельвыканкома тав. Грышкевіч замест прыняцця належных мер займаецца разважаннямі, што аб сяўбе азімых гутарыць яшчэ не прышоў час.

Бестурботна адносяцца да сяўбы азімых і ў райземаддзеле (заг. тав. Зорын). Дырэктывы і планы сяўбы спусцілі і на гэтым супакоіліся. І не дзіўна, што на сёнешні дзень у Райзо няма ніякіх даных аб становішчы з сяўбой ў сельсоветах. Мусіць і работнікі райземаддзела думаюць, што сеяць яшчэ рана і пагэтаму можна пачакаць.

Сяўба азімых—мерапрыемства, патрабуючае аператыўнага кіраўніцтва і з боку Райзо і з боку Выканкомаў сельскіх советаў.

Па-першае, трэба правесці растлумачальную работу сярод сялян, што пачынаць сяўбу трэба ўжо зараз і неадкладна. Ранняя сяўба—залог будучага ўраджаю.

Па-другое, трэба арганізаваць узаемадапамогу бясконным гаспадаркам з тым, каб ні адзін гектар азімага кліна не застаўся-б не засеяным.

І трэцяе—сяўба павінна быць праведзена ў сціслыя тэрміны на добра апрацаванай і ўгноенай глебе.

Выкананне гэтых умоў дасць нам высокі ўраджай азімых у наступным годзе.

Усе сілы на своечасовае правядзенне сяўбы азімых!

# ПРАЦОЎНЫЯ КОСАЎСКАГА РАЁНА ВІТАЮЦЬ ПАБЕДАНОСНАЕ ЗАКАНЧЭННЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## МІТЫНГ У ІВАЦЭВІЧАХ

3-га верасня ў дзень перамогі над Японіяй, адбыўся многалюдны мітынг працоўных гарадскога пасёлка Івацэвічы.

Паведамленне аб капітуляцыі Японіі і заканчэнні другой сусветнай вайны зрабіў сакратар РК КП(б)Б тав. Маркушын

—Другі ачаг агрэсіі на Далёкім Усходзе—Японская ваеншчына—разгромлен і ніколі не будзе пагражаць мірнай працы совецкага народа і ўсіх свабодалюбівых народаў свету. Гэта перамога, як і перамога над гітлераўскай Германіяй, дасягнута дзякуючы несакрушальнай ваеннай і эканамічнай магутнасці нашай дзяржавы, дзякуючы вялікай згуртаванасці ўсяго совецкага народа вакол партыі Леніна—Сталіна. Гэта перамога дасягнута ўпорнай, кровапралітнай барацьбой Чырвонай Арміі на франтах і самаадданай, напружанай працай усяго совецкага народа ў тылу.

Усваім выступленні старшыня Камітэта профсаюзнай арганізацыі лесазавода № 13 т. Захарчук заявіў:

—Рабочыя нашага завода з радасцю сустрэлі вестку аб разгроме імперыялістычнай Японіі і поўнай капітуляцыі яе ўзброеных сіл. Гэтай перамогай мы абавязаны нашаму любімаму правадыру і настаўніку Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Генералісімусу Совецкага Саюза тав. Сталіну.

У азнаменаванне гістарычнай перамогі над Японіяй і заканчэння другой сусветнай вайны калектыў рабочых і служачых нашага завода ўзяў абавязацельства працаваць яшчэ лепш, каб сваёй самаадданай працай з дня ў дзень умацоўваць ваенную і эканамічную магутнасць нашай любімай Радзімы.

—Чыгуначны транспарт нашай дзяржавы,—гаворыць у сваім выступленні начальнік станцыі Івацэвічы тав. Мультан, —і ў вялікай Айчыннай вайне супроць Германіі і ў вайне супроць японскай ваеншчыны вытрымаў такую нагрузку, якую не вытрымаўбы транспарт любой другой краіны. Наш транспарт унёс вялікі ўклад у агульную справу перамогі над ворагамі нашай совецкай Айчыны.

Натхнёныя заканчэннем другой сусветнай вайны, рабочыя і служачыя станцыі Івацэвічы зробяць усё неабходнае, каб забяспечыць бесперабойную і чоткую работу станцыі.

Пад гром незмаўкаючых апладысментаў удзельнікі мітынга паслалі прывітальную тэлеграму арганізатару гістарычных перамог совецкай зброі Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Генералісімусу Совецкага Саюза т. Сталіну.

## Абавязацельствы рабочых лесазавода

Да дня перамогі над Японіяй калектыў рабочых і служачых Івацэвіцкага дзяржаўнага лесазавода прышоў са значнымі поспехамі ў выкананні вытворчых норм выпрацоўкі.

Стаханаўцы завода машыніст Верстак І. Ф., рамшчыкі. Белы К. А., Барысік Л. і другія ўвесь час выконвалі дзённыя нормы на 105-115 проц.

Зараз у гонар заканчэння другой сусветнай вайны яны ўзялі на сябе абавязацельства выконваць нормы выпрацоўкі не менш чым на 120 проц.

У азнаменаванне перамогі над японскім агрэсарам, рыхтуючыя дастойна сустрэць 6-ю гадавіну з'еднання беларускіх зямель у адзіную Беларускую дзяржаву, на заводзе разгарнулася шырокае социялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі і асобнымі рабочымі.

Рабочыя завода гараць жаданнем сваімі працоўнымі поспехамі яшчэ больш праслaвіць нашу любімую радзіму.

**ГАЛІНА ЛОГІНАВА.**

## На мітынгу ў в. Стайкі

З вялікай радасцю і лікаваннем сустрэлі сяляне в. Стайкі Стайкаўскага сельсовета вестку аб пабеданосным заканчэнні вайны з Японіяй.

4 верасня тут адбыўся мітынг. Сяляне і сялянкі вёскі ў чэсць пабеданоснага заканчэння другой сусьветнай вайны ўзялі на сябе абавязацельства:

1. Па заклiку сялян і сялянак Дамачаўскага раёна уключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва і да 17 верасня —Дня аб'еднання заходняй Беларусі ў адзіную Беларускую дзяржаву поўнасцю выканаць план здачы хлеба дзяржаве і другіх сельгаспрадуктаў.

2. Своечасова і добраякасна правесці азімую сяўбу, аказваючы ўзаемадапамогу цяглавай сілай бясконным гаспадаркам воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў барацьбе за нашу совецкую радзіму.

**А. КАЛІНА**

## Для роднай дзяржавы

Не выказаць той радасці, з якой сустрэлі мы, сяляне і сялянкі, дзень перамогі над крывавым японскім імперыялізмам. Нам, перажыўшым жахі трохгадовай нямецкай акупацыі, асабліва дорага гэта перамога, бо мы ведаем, што ніколі больш не вернуцца такія цяжкія чорныя дні, што перад намі паўстае шчаслівая, светлая будучыня.

Мне 63 годы. Два сыны мае служаць Радзіме у радах слаўнай Чырвонай Арміі. Па старасці год совецкая ўлада дала мне льготу па сельгаспадатках. У азнаменаванне нашых вялікіх перамог над ворагамі, у чэсць надыходзячага вялікага свята 17 верасня я рашыла дабравольна здаць у фонд Чырвонай Арміі 12 пудоў хлеба.

Заклікаю ўсіх сялян і сялянак паследаваць майму прыкладу.

**Фёкла Мошка, сялянка хут. Белы Двор Стайкаўскага сельсовета.**

## Добра убраць і захаваць насенне лубіна

Адным з сродкаў для аднаўлення ўрадлівасці палей вельмі знясіленых у перыяд нямецкай акупацыі, з'яўляецца ўнядрэнне ў кожную гаспадарку пасеваў лубіна на зялёнае ўгнаенне. На пяшчаных і супяшчаных глебах лубінавыя папары з'яўляюцца абавязковымі.

Лубін з'яўляецца выдатным угнаеннем. Ураджай бульбы па лубіну, заараному на зялёнае ўгнаенне на пясках, павышаецца ў два-тры разы, а азімага жыта на 10-15 цэнтнераў з гектара. Лубін мае уласцівасць абагачваць глебу азотам (ад 100-200 кілаграм азота на адзін га) шляхам засваення яго з паветра пры дапамозе клубеньковых бактэрый, якія жывуць на яго карэннях. Адзін гектар пасева лубіна дае больш арганічнага ўгнаення, чым 100-200 вазоў гною. Асабліва карысны для ўгнаення шматгадовы лубін, які дае да чатырох укосаў за сезон.

Велізарнае значэнне лубіна абавязвае ўсіх кіраўнікоў калгасаў і аднаасобныя сялянскія гаспадаркі пасевы ў гэтым годзе скарыстаць выключна на насенныя мэты. Трэба дабіцца таго, каб з 1945 года ўсе калгасы рэспублікі мелі насенныя ўчасткі лубіна размерам ад двух да пяці гектараў.

У гэтым годзе ўраджай лубіна чакаецца добры. Большасць пасеваў ужо квітнее і завязваюцца бабы. Трэба добра падрыхтавацца да ўборкі багатага ўраджая лубіна. Пры ўборцы лубіна на насенне трэба мець на ўвазе некаторыя яго асаблівасці. З прычыны таго, што лубін паспявае няроўнамерна, уборку ўручную (невялікіх плошчаў), трэба рабіць у два-тры прыёмы. Раней паспяваюць ніжнія бабы. Верхнія і бабы бакавых галін паспяваюць пазней. Убіраць неабходна ў ранішнія і вячэрнія гадзіны, каб не дапусціць асыпання зерня. Асабліва вялікае асыпанне наглядаецца ў жоўтага лубіна. Убраць лубін на насенне неабходна да наступлення асенніх замаразкаў.

Скошаны або выдзернуты рукамі лубін прасушваецца ў полі ў невялікіх копіцах. Як толькі яны падсохнуць, неабходна пачаць абмалот, не адкладваючы яго да вясны.

Пасля абмалоту насенне неадкладна ачышчаецца ад смецця. Хаваць насенне лубіна трэба тонкім пластом у 30—40 см., пры вільготнасці яго не больш 15 працэнтаў. Насенне трэба рэгулярна пералапачваць.

Лепшым месцам для хавання насення лубіна з'яўляецца сухое памяшканне з добрай вентыляцыяй. На працягу восені—зімы неабходна не менш двух разоў праверыць насенне ў раённай кантрольна-насеннай інспекцыі на вільготнасць, усхожасць, чыстату і захворванне грыбком.

Ураджай насення пры правільнай агратэхніцы дасягае з гектара 15—30 цэнтнераў і больш. Норма высева на насенне 100-135 кілаграмаў і на зялёнае ўгнаенне жоўтага лубіна—160, а сіняга—200 кілаграмаў. Гэтай нормай трэба кіравацца пры засыпцы насення.

Урадам устаноўлены льготы пры здачы насення лубіна ў загатзярно і Дзяржсортфонд. Так, пры здачы аднаго цэнтнера кандыцыйнага насення лубіна залічваецца два цэнтнеры зернавых.

АГРАНОМ Ф. ЛЕВІНА.

## ТРАКТАРЫ НА ВОРЫВЕ

У Грыўдзенскім сельсовеце працуюць на сваім трактары трактарысты Малаў Іван і Ганчар Ігнат. Пад азімую сяўбу і зяблі яны ўжо ўзаралі 18 гектараў, аказаўшы дапамогу 16 бясконным гаспадаркам воінаў Чырвонай Арміі і загінуўшых партызан.

У часць перамогі над Японіяй трактарысты павялічваюць норму выпрацоўкі і эканомію гаручага.

І. САЛОМЕНІК

## Голас правадыра

Пену хваля ціхаакіянская
кідае,
Заціх гром доўгачаканых
дат.
У гліняны гарадок Кітая
Прынёс сонца
Сталінскі салдат
Ад Хабараўска
Да Порт-Артура
Адгрымела
Танкавая бура.
Узняла яна пяскоў сыпучых
дзюны,
Буйны вал маньчжурскае
травы.
Скалыхнулі грозныя тайфуны
У японскіх водах
Астравы.
Цішыня стаіць,
Звініць
Па-над аглохлым светам,
Вершамі сцякаючы з пяра.
І плыве
Над ціхаю планетай
Голас нашага Правадыра.
У ім слава сонечная
будучыні нашай,
Для планеты непагасны
дзень.
Дзе цвіце
У песнях і у маршах
Імя Сталіна—
Вясны прамень.

АНАТОЛЬ ВЯЛЮГІН.

## ЗВОДКА

Аб ходзе выканання плана хлебанарыхтовак і ў фонд Чырвонай Арміі на 8 верасня г.г.

| Назва сельсовета | Процант выканання |
|---|---|
| 1 Івацэвіцкі | 88 |
| 2 Жытлінскі | 53 |
| 3 Грыўдзенскі | 52 |
| 4 Яблонскі | 47 |
| 5 Любішчыцкі | 45 |
| 6 Сенькавіцкі | 44 |
| 7 Косаўскі | 43 |
| 8 Стайкаўскі | 43 |
| 9 Гошчаўскі | 41 |
| 10 Бусяжскі | 39 |
| 11 Яглевіцкі | 38 |
| 12 Падстарыньскі | 34 |
| 13 Белавіцкі | 34 |
| 14 Альбінскі | 26 |
| 15 Альшаніцкі | 25 |
| Усяго па раёну | 38,7. |

Адказны рэдактар А. П. РУДОЙ.

ГЛ 15285

Адрас рэдакцыі: Івацэвічы, вул. Шасейная, 11.